Максимальное получение прибыли в основном связывается со снижением производственных издержек. Однако, в условиях, когда самими затратами организации может управлять в основном только расход их количества, а цена на каждый входной материал (ресурс) практически неуправляемая, в условиях незамедляющейся инфляции и бесконтрольности организация крайне ограничена в возможности снижать производственные издержки, добиваясь таким путем увеличения прибыли.

УДК 99(476)
**ШОСТАК К. С.**, студэнтка
Навуковы кіраўнік **КОТАВА С.М.**, ст. выкладчык
УА «Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

**УРАЧ-ПАТРЫЁТ**

Мамонава Ганна Мікалаеўна нарадзілася ў Расіі. У горадзе Волагдзе ў даваенныя гады атрымала спеціяльнасць зубнога ўрача. У гэтым жа горадзе пачала сваё працоўнае жыццё. Карысталася вялікай павагай у насельніцтва. Там жа выйшла замуж за авіяінжынера І.П. Мамонава. Незадоўга да вайны Ганна Мікалаеўна са сваімі чатырма дзецьмі прыехала ў вёску Копці Віцебскага раёна к родным мужа. Там яе і застала вайна.

Калі ў вёску прыйшлі фашысты, стараста прымусіў Г.М. Мамонаву працаваць у Высачанскай бальніцы, дзе яна бясплатна аказвала медыцынскую дапамогу мясцоваму насельніцтву. Жанчына-ўрач добрасумленна выконвала сваю працу і, не баючыся ворага, аткрыта казала, што фашыстаў разаб'юць, што перамога будзе за савецкім народам.

Летам 1942 года баявы лётчык Н.Г. Багданаў атрымаў баявое заданне – высадзіць у лесе пад Віцебскам дыверсійную групу. Заданне было паспяхова выканана, але пры вяртанні фашысты падбілі самалёт. Лётчык, моцна апалены, цяжка паранены, 18 сутак прабіраўся да сваіх. У найцяжэйшым стане ён быў падабраны партызанамі атрада А.А. Блахіна, брыгады "Аляксея" (Данукалова) у раёне мястэчка Чысцік. Летчыку патрэбна была тэрміновая медыцынская дапамога. Тады партызаны звярнуліся да Мамонавай Ганны Мікалаеўны. Тут жа, на паляне, у лесе была зроблена аперацыя байцу. Хутка яго стан палепшыўся, і ён быў перапраўлены на Вялікую зямлю, а потым і зноў уступіў у баявы строй.

Але знайшоўся здраднік, які выдаў Ганну Мікалаеўну фашыстам. Яе схапілі ў Высачанах. Разам з 18-цю патрыётамі яна падверглася катаванню. Змучаных, але не зломленых немцы перагналі іх у вёску Высокае, прымусілі саміх капаць сабе яму і растралялі. У хату да Мамонавых з'явіліся фашысты і забралі траіх дзяцей Ганны Мікалаеўны, растлумачыўшы гэта тым, што іх запрасіла маці, каб прывесці да яе. Ад'ехаўшы ад вёскі, каты ў полі стрэламі ў галаву забілі дзяцей. Старэйшая дачка Мамонавай, Надзея, на гэты момант была ў суседзяй, што яе і выратавала (пазней добрыя людзі яе ўдачарылі). Родным і мясцовым жыхарам удалося пахаваць забітых дзяцей, а тыдні праз тры раскапаць магілу ў вёсцы Высокае. Цела Ганны Мамонавай было ўпотайку перазахована ў адну магілу з дзяцьмі на могілках у весцы Копці.

Назаўсёды застанецца добрая памяць аб урачы-патрыёце, якая асабістым жыццём падцвердзіла добрая імя ўрача. Пасля вайны, на народныя ахвяраванні, першага верасня 1968 года быў узведзены сціплы абеліск з чырвонай зорачкай - помнік патрыётцы.



РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ